***Г. А. Гваздовіч***
*кандыдат філалагічных навук,*
*дацэнт кафедры славянскіх моў*
*Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта*

# ЖЫЦЦЁ, НАПОЎНЕНАЕ ЛЮБОЎЮ…

Любачка…Любка…Люба…Любоў Адамаўна… Многім, хто жыў і працаваў побач з ёю, сёння не хапае яе бадзёрай натхнёнасці і філасофскай стрыманасці, яе энергіі і душэўнага цяпла… З ёю было добра, утульна, светла…І вось ужо больш за трынаццаць гадоў прайшло, як закончыўся зямны шлях Любові Адамаўны Антанюк – доктара філалагічных навук, прафесара.

За амаль 35-гадовы прафесійны шлях Л. А. Антанюк пакінула пасля сябе больш за 120 навуковых прац, сярод якіх манаграфіі, вучэбныя дапаможнікі, тэрміналагічныя слоўнікі, а таксама шматлікія навуковыя артыкулы.

Як руплівая гаспадыня і пяшчотная маці, улюбёная ў сваю працу і жыццё, Любоў Адамаўна крупінка да крупінкі папаўняла скарбонку беларускага мовазнаўства, працавала на будучыню.

Нарадзілася Любоў Адамаўна Антанюк 28 красавіка 1949 г. у в. Ломыш Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці. Ад роднай зямлі і бацькоў Л. А. Антанюк атрымала ў спадчыну вялікі талент і шчодрасць душы, якімі яна паўсядзённа дзялілася са сваімі калегамі і вучнямі.

У 1973 г. Любоў Адамаўна скончыла аспірантуру пры аддзеле агульнага і славянскага мовазнаўства Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР і абараніла кандыдацкую дысертацыю на тэму «Лексіка-граматычныя катэгорыі сумеснага і ўзаемнага дзеяння ў сучаснай беларускай літаратурнай мове». З гэтага часу па 1991 г. працавала ў Інстытуце мовазнаўства імя Я. Коласа на пасадах малодшага навуковага супрацоўніка, старшага навуковага супрацоўніка. З 1991 г. – на педагагічнай працы: дацэнт (1991 г.), прафесар (1993 г.) кафедры беларускай мовы БДУ. У 1992 г. абараніла доктарскую дысертацыю на тэму «Беларуская навуковая тэрміналогія: фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне». З 1998 г. – загадчык кафедры беларускай

мовы і беларусазнаўства Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, з 2001 г. – загадчык кафедры беларусазнаўства.

Л. А. Антанюк была натхняльнікам і дбайным знаўцам тэрміналагічнай працы: вучоны сакратар і старшы навуковы супрацоўнік тэрміналагічнай камісіі АН БССР (з 1980 г. па 1992 г.), першы навуковы рэдактар афіцыйнага органа гэтай камісіі – «Тэрміналагічнага зборніка». Яна з'яўлялася членам Міжнароднай арганізацыі па ўніфікацыі тэрміналагічных неалагізмаў (МАУТН), віцэ-прэзідэнтам Міжнароднай федэрацыі тэрміналагічных банкаў (МФТБ), членам рэдкалегіі і адным з аўтараў часопіса «Neoterm» – афіцыйнага органа МАУТН.Любові Адамаўне належыць першае ў беларускім мовазнаўстве комплекснае тэарэтычнае даследаванне беларускай тэрміналогіі, вынікі якога найбольш поўна выкладзены ў манаграфіі «Беларуская навуковая тэрміналогія» (1987).

Пад кіраўніцтвам і пры ўдзеле Л. А. Антанюк паспяхова завершана ў межах рэспубліканскага «Плана найважнейшых навуковых даследаванняў» тэма «Генетычныя, структурна-семантычныя і функцыянальныя асаблівасці лексічных інавацый у сучаснай беларускай мове» (2002), тэма «Упарадкаванне і сістэматызацыя беларускай тэхнічнай тэрміналогіі» Рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў, тэма «Беларуская музычная тэрміналогія» і інш.

Прафесар Л. А. Антанюк вялікую ўвагу надавала падрыхтоўцы і напісанню дапаможнікаў па беларускай мове, дзе ў поўнай ступені праявіўся яе педагагічны талент, арганізатарскія якасці, уменне даводзіць справу да лагічнага завяршэння з найлепшымі вынікамі. На працягу 2001–2004 гг. вялася работа па ўнутрыакадэмічнай тэме «Кампендыум па беларускай мове». У 2003 г. з'явілася фундаментальная працаБ. А. Плотнікава і Л. А. Антанюк аб'ёмам 671 с. «Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум», за якую аўтары атрымалі Ганаровую грамату Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Падрыхтаваны Л. А. Антанюк у суаўтарстве з выкладчыкамі БДУ (З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя, В. М. Кныш) падручнік «Беларуская мова» для сярэдняй школы атрымаў на Рэспубліканскім конкурсе дыплом Міністэрства адукацыі «Падручнік 1999 года». Любоў Адамаўна распрацавала вучэбны курс для студэнтаў, навучальныя дапаможнікі «Беларуская мова: спецыяльная лексіка» (разам зБ. А. Плотнікавым), «Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія» і інш.

Праца з Любоўю Адамаўнай Антанюк прыносіла плён маладым навукоўцам: аспірантам, дысертацыі якіх пісаліся пад яе кіраўніцтвам і

паспяхова абараняліся, а таксама тым, чые дысертацыі яна апаніравала або за чые аддавала свой голас, з’яўляючыся членам Савета па абароне дысертацый пры Белдзяржуніверсітэце, Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце.

Вучні Любові Адамаўны паспяхова працуюць у самых розных месцах Беларусі і за яе межамі. Яна была выдатным педагогам, не толькі вучыла, але і выхоўвала сваіх студэнтаў, аспірантаў, стажораў… Яна любіла іх, любіла людзей, жыццё, любіла па-свойму, так, як магла цаніць і любіць толькі яна, адпавядаючы свайму імені – Любоў…

Любоў Адамаўна любіла сваю краіну, сваю мову, сваю сям’ю, была адданай ім, заўсёды шчыра радавалася поспехам сваіх калег, вучняў, родных, мужна пераносіла ўсе няўдачы і нягоды, глыбока хвалявалася за лёс любімай навукі…

Праца Любові Адамаўны мае свой працяг: кнігі, суаўтарам якіх яна была, запатрабаваны, перавыдаюцца…

Хто быў знаёмы з Любоўю Адамаўнай, памятае яе добразычлівую ўсмешку, адкрыты погляд, гатоўнасць дапамагчы, адазвацца на чужы боль, забываючы пра свой, памятае, як шчыра яна спявала беларускія песні… Найлепшая памяць пра Любоў Адамаўну Антанюк – яе сям’я, яе кнігі і артыкулы, а таксама вучні, якіх яна вучыла любіць беларускае слова, ашчадна ставіцца да роднай мовы.